# ТЭАТРЫ ГУЛЬНІ Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНАЙ СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

**Сергейчук Д.П.**
*магістр педагагічных навук, выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і святаў УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», аспірант кафедры педагогікі і сацыякультурнай дзейнасці БДУКМ (Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучаснай святочнай культуры Беларусі ніводны юбілей, ці свята горада, ніводная ўрачыстасць гарадскога, раённага, абласнога, а тым больш рэспубліканскага маштабу не абыходзяцца без гульнёва-забаўляльных пляцовак, з народнымі традыцыйнымі і сучаснымі забавамі і гульнямі.

Сёння традыцыйныя народныя гульні, якія былі звязаны з гаспадарчымі справамі, жыццёвымі адносінамі, маюць значэнне не столькі для выхавання адпаведных навыкаў і засваення нормаў паводзін, колькі пазнавальнае.

На дадзеным этапе развіцця народнай гульнёвай творчасці, недастаткова развіта метадычна-арганізацыйная дзейнасць у арганізацыі і правядзенні фестываляў і святаў гульні (якія амаль з пачатку 1990-х гг на Беларусі не праводзяцца). Конкурсы арганізатараў вольнага часу, гульнёва-забаўляльных праграм толькі паўстаюць, як састаўная частка святочна-відовішчнага элемента культуры ў агульным святочным календары.

Арганізацыя гульнёвых пляцовак на святах не заўсёды дае магчымасць прывабіць у дзею значную колькасць людзей, садзейнічае іх актывізацыі і стварыць жыццярадасны настрой ў гледачоў.

Сёння кваліфікацыйныя патрабаванні да арганізатараў вольнага часу вельмі высокія: гэта прафесійнае майстэрства, уменне працаваць з людзьмі, арганізацыйныя якасці. Але галоўнае яны павінны ведаць народныя гульні, валодаць тэхналогіяй арганізацыі і правядзення гульняў і гульнёвых праграм. Пры стварэнні гульнёвай праграмы трэба вылучаць тэматычную накіраванасць, ведаць некаторыя прынцыпы адбору гульняў, якія будуць выкарыстоўвацца пры яе правядзенні, прыёмы актывізацыі гледачоў і г.д. Пры стварэнні традыцыйнай гульнёвай праграмы трэба ўлічваць мясцовыя рэгіянальныя традыцыі, вынаходзіць адметныя рысы гульнёвых дзей, пры правядзенні той ці іншай народнай гульні. Неабходна тлумачыць значэнне праходзячых гульнёвых дзей, выкарыстанне носьбітаў дзей адпаведных беларускіх абрадаў.

Сёння з вывучэннем і практычным выкарыстаннем народных гульняў звязана творчасць тэатраў народнай гульні. Тэатры гульні – гэта і каляднае пераапрананне, і выканальніцкае майстэрства казачнікаў, і тэатральнае дзеянне карагодных ігрышчаў і маскаванне. У тэатрах гульні рэалізуецца працэс народнага выхавання праз сінтэз розных відаў дзейнасці: песню, музыку, жарт, гумар і галоўнае гульню, але, на вялікі жаль не ў поўным аб’ёме.

Дзеля гэтага патрэбна павышаць якасць і ўзровень правядзення конкурсаў паміж тэатрамі гульні, павышаць прэстыж конкурсаў прафесійнага майстэрства арганізатараў па гульнёвай творчасці. Ва ўстановах культуры і адукацыі ствараць новыя творчыя лабараторыі па рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу гульні, з мэтай падняць гульнёвы жанр на больш якасны і прафесійны ўзровень.

Прааналізаваўшы навуковую, мастацкую і метадычную літаратуру, зрабіўшы яе аналіз мы прыйшлі да высновы, што педагагічныя аспекты ў народна-гульнёвай дзейнасці на Беларусі маюць даўнія карані і грунтуецца на фальклорна-этнаграфічнай аснове. Творчыя навыкі, прыёмы выканання, характэрныя пераемнасць і ўстойлівасць мастацкіх традыцый перадавалася з пакалення ў пакаленне, і замацоўвалася ў свядомасці, як маральна-этычная традыцыя выхавання новага пакалення. Бо здаўна вядома, што першапачатковае прызначэнне народнай гульні ў свяце – гэта выхаванне ў чалавека пачуцця нацыянальнай прыналежнасці, патрыятызму, смеласці, лоўкасці, эстэтычнага густу, волі да перамогі [2].

Аналізіруючы этнаграфічныя і літаратурныя матэрыялы па народнай гульні вядомых навукоўцаў і фалькларыстаў назіраецца цесная сувязь народнай гульні з земляробчымі каляндарнымі святамі беларусаў. Народнай гульня як эфектыўная дзейная форма выхавання падрастаючага пакалення захавала сваё актуальнае значэнне і ў цяперашні час, але на вялікі жаль, выкарыстанне яе адбываецца не ўпоўным аб'ёме, па прычыне з'яўлення новых, замяшчальных традыцыйным, накірункаў у сацыякультурнай дзейнасці.

Зараз народная гульня мае свабоднае існаване толькі ў традыцыйных народных святах і аматарскіх мастацкіх аб'яднаннях, што абмяжоўвае ўплыў народнай гульні на выхаваўчы працэс у сістэме сучаснага выхавання дзяцей, тым больш не дастаткова адбываецца рэалізацыя яе педагагічнынага патэнцыялу і выхаваўчых магчымасцяў.

З гісторыі відаць, што народная гульня на працягу ўсяго часу існавання знаходзіцца ў стадыі пастаяннага развіцця і ўдасканальвання, якая непасрэдна ўплывае на сацыякультурную сітуацыю ў грамадстве.

Мэтанакіраванасць і функцыянальнасць традыцыйнай народнай гульні застаецца стабільнай платформай выхавання патрыатычна-духоўных і фізічных якасцяў асобы, фарміравання характэрных адметнасцяў пэўнай нацыі. Нягледзячы на час народная гульня адапціруецца, рэгінірыруецца і прыстасоўваецца да сучасных сацыякультурных запатрабаванняў грамадства, актыўна ўключаючыся ва ўсе сферы дзейнасці соцыўма.

Калі разглядзець народную гульню з пункту гледжання сацыякультурнай дзейнасці, то асноўным функцыянальным накірункам яе з'яўляецца выхаваўча-педагагічная аснова. Эстэтычнае, мастацка-творчае, рэлігійна-духоўнае выхаванне, перадача з пакалення ў пакаленне вусна-паэтычных і духоўна-нацыянальных каштоўнасцей, сацыялізацыя, нацыяналізацыя і гуманізацыя грамадства адбываецца па сродкам эфектыўнага ўздзеяння выхаваўчых магчымасцей народнай гульні на чалавека. Народная гульня, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жывы арганізм мае эвалюцыйныя перыяды свайго развіцця: ад найпрасцейшых манафункцыянальных, да складаных (змешаных) поліфункцыянальных форм і прыёмаў рэалізуецца [1].

Таму на сучасным этапе арганізацыі і правядзення свята патрэбна рэаніміраваць практычную значнасць гульні, максімальна выкарыстаць яе творчы і выхаваўчы патэнцыял ў сістэме сацыякультурнай дзейнасці.

Зараз развіццё сучаснага грамадства настойліва патрабуе адмысловай увагі да праблем навучання і выхавання. Пошукі прынцыпова новых метадаў і падыходаў у сістэме выхавання прадбачаць рэалізацыю найважных педагагічных задач сацыякультурнай дзейнасці. Сёння, у век пасняховых інфармацыйных працэсаў час дыктуе свае ўмовы суадносін чалавека з грамадствам.

Сёння як ніколі патрэба выхоўваць эстэтычны густ, развіваць гуманасць, прывіваць духоўна-цэнасны арыенцір, які будзе стандартнам чалавечнасці. Трэба вяртаць апрабаваныя гісторыяй віды праяўлення чалавечай актыўнасці, выбарачна адносіцца да сучасных відаў гульняў, дзеля гэтага патрэбна надаць народнай гульні статус адной з асноўнай у працэсе выхавання дзяцей. На педагагічныя магчымасці народнай гульні ў свае часы звярталі ўвагу вядомыя навукоўцы, педагогі і псіхолагі, такія як, А.Г. Кіркор, С. Цярохін, П.В. Шэйн, Я.Р. Вількін, Е.Р. Раманаў, М.Я. Нікіфароўскі і інш.

Народная гульня дапаўняе святочна-абрадавую культуру Беларусі. Народная гульня стала паўнапраўным эпізодам святочных мерапрыемстваў. Але ж на вялікі жаль, творчы і выхаваўчы патэнцыял беларускіх народных гульняў у святочнай культуры рэалізуецца не ўпоўным аб'ёме і патрабуе больш глыбокага і дэталёвага вывучэння. Дзеля гэтага для паляпшэння ўмоў выкарыстання народнай гульні, патрэбна ствараць спецыялізаваныя дапаможнікі для павышэння якаснай кваліфікацыі спецыялістаў у сферы гульнёвай творчасці.


1. *Гуд, П.А.* Тэхналогія стварэння свята : вучэбны дапаможнік / П.А. Гуд ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск , 2004. – 271 с.
2. *Вількін, Я.Р.* Беларускія народныя гульні / Я.Р. Вількін. – Мінск, 1969. – 276 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ